моўнай сістэмы. Тое самае можна сцвярджаць і аб характары функцыянавання сінтаксічных канструкцый з атрыбутыўным значэннем. У тэкстах на беларускай мове безумоўная перавага аддаецца даданым азначальным сказам у адрозненні ад рускай, дзе пашырана ўжыванне дзеепрыметнікавага словазлучэння (пры яго факультатыўным характары) *человек, сидящий у сбора пошлин — чалавек, што сядзеў на мытні* (Ев., 57). Пры існаванні ў беларускай мове двух сінтаксічных сінонімаў (дзеепрыметнікавае словазлучэнне — даданы азначальны сказ) на падставе аналізу іх ўжывальнасці ў тэкстах (адпаведна 20 і 47 выпадкаў) можна убачыць розную прадуктыўнасць у выкарыстанні дзеепрыметнікавага словазлучэння, яго стылістычную абмежаванасць.

Супастаўленне тэкставага матэрыялу дазваляе істотна ўдакладніць і дапоўніць карціну падабенстваў і адрозненняў паміж мовамі, якая існуе ў межах сістэмна-структурнага супастаўлення: убачыць і падкрэсліць адрозненні ў функцыянаванні граматычных катэгорый у кожнай з моў, улічыць усе сродкі выражэння катэгарыяльных значэнняў (лексічныя, словаўтваральныя, фармальна-марфалагічныя, сінтаксічныя), сканцэнтраваць увагу на падабенствах і адрозненнях у сферы узусу, калі крытэрыям тоеснасці ці адрознення моў з'яўляецца норма і заканамернасці выбару сродкаў выражэння з групы сінанімічных, а іх рэалізацыя сведчыць аб цэнтральным або перыферыйным палажэнні кожнага ў моўнай сістэме.

[1] Гл.: Шчэрбін В. К. Супастаўляльная лінгвістыка // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн., 1994. С. 544.

[2] Гл.: Конюшкевіч М. І. Синтаксис близкородственных языков: тождество, сходства, различия. Мн., 1988; Киселёв И. А. Категория рода существительных в русском и белорусском языках // Русский язык. 1988. Вып. 8; Сопоставительное описание русского и белорусского языков: Морфология. Мн., 1990.

[3] Гл.: Будагов Р. А. К теории сходств и различий в грамматике близкородственных языков // ВЯ. 1980. № 4; Ярцева В. Н. Контрастивная лингвистика. М., 1981; Яе ж. Теория и практика сопоставительного исследования языков // ИАН СЛЯ. 1986. № 6; Гак В. Г. Сравнительная типология французского и русского языков. М., 1989.

[4] Будагов Р. А. Близкородственные языки и некоторые особенности их изучения // Типология сходств и различий близкородственных языков. Кишинёв, 1974. С. 4.

[5] Кшешовский Т. П. Эквивалентность, конгруэнтность и глубинные структуры // НЗЛ. Вып. XXV. Контрастивная лингвистика. М., 1989. С. 327.

[6] Косериу Э. Контрастивная лингвистика и перевод: их соотношение // НЗЛ. С. 70; Штернеманн Р. и колл. Введение в контрастивную лингвистику // Там жа. С. 148.

[7] Сопоставительное изучение грамматики и лексики русского языка с чешским и др. славянскими языками. М., 1983. С. 6.

[8] Дипломатический словарь. Т. 1. М., 1984. С. 103; Юридический энциклопедический словарь. М., 1984. С. 371; Большая Советская Энциклопедия. Т. 2. М., 1969. С. 416.

[9] Косериу Э. Назв. праца. С. 77.

[10] Русско-белорусский словарь. Т. 1. Мн., 1993. С. 693.

[11] Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 2. Мн., 1977. С. 737; Русско-белорусский словарь. Т. 1. С. 688.

[12] Конституция Республики Беларусь. Мн., 1994. — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мн., 1994; Евангелие господа нашего Иисуса Христа на четырёх языках: эллинском, славянском, российском и белорусском с параллельными местами. Мн., 1991; Белорусская ССР: Краткая энциклопедия. Т. 1. Мн., 1987. — Беларуская ССР: Кароткая энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 1979; Вечерний Минск. 1989. 18 декабря. — Вячэрні Мінск. 1989. 18 снежня; Выбар за Вамі. Навучальныя ўстановы новага тыпу г. Мінска: інстытуты, каледжы, гімназіі, ліцэі: Даведнік (на беларускай і рускай мовах). Мн., 1993.

[13] Зализняк А. А. Русское именное словоизменение. М., 1967. С. 88 і наст.

[14] Беларуская граматыка. Т. 1. Мн., 1985. С. 111.

У. Б. ЖУРАВЕЛЬ

ПРАСЛАВЯНСКІ ВАКАЛІЗМ ПОЗНЯГА ПЕРЫЯДУ І ЯГО ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў БЕЛАРУСКАЙ І БАЛГАРСКАЙ ЛІТАРАТУРНЫХ МОВАХ

Разглядаючы лёс праславянскіх галосных фанем у беларускай і балгарскай мовах, мы, следам за У. В. Колесавым, зыходзім з таго, што рэпертуар праславянскага вакалізму на познім этапе яго развіцця складалі

функцыянальна нераўназначныя элементы. Адны з іх мелі абмежаваную дыстрыбуцыю, уваходзілі ў нязначную колькасць фаналагічных апазіцый і таму былі параўнальна слаба нагружаны ў функцыянальных адносінах, г. зн. былі функцыянальна слабымі. Да такіх, па меркаванню У. В. Колесава, адносіліся насавыя /*о/ і /*е/, рэдукаваныя /*ъ/ і /*ь/, а таксама /*е/ (яць). Наадварот, фанемы /*а/, /*о/, /*е/, /*і/, /*у/, /*u/ мелі шырокія дыстрыбутыўныя магчымасці, уваходзілі ў вялікую колькасць апазіцый, таму іх можна разглядаць як функцыянальна моцныя фанемы[1]. Такое размежаванне з'яўляецца, на нашу думку, вельмі важным для тлумачэння агульных напрамкаў змен састава і сістэмы праславянскіх галосных у розных славянскіх мовах, у тым ліку ў беларускай і балгарскай, паколькі іменна функцыянальна слабыя элементы падвяргаліся самым істотным пераўтварэнням.

Рэфлексы функцыянальна моцных праславянскіх вакалаў захавалі ў беларускай і балгарскай мовах асноўныя прыметы адпаведных праславянскіх галосных фанем. Так, найбольш частым рэфлексам праславянскай /*і/ будзе і ў беларускай, і ў балгарскай мовах /і/ з тымі ж дыферэнцыяльнымі прыметамі, што пацвярджаецца, напрыклад, такімі супастаўленнямі стараславянскіх (як найбольш старажытных) форм з беларускімі і балгарскімі, як ст.-сл. БИТИ — бел. **біць**, балг. **бия**; ст.-сл. ПИТИ — бел. **піць**, балг. **пия** і шмат інш. Без істотных змяненняў перайшлі на беларускую і балгарскую глебу праславянскія галосныя /*u/: ст.-сл. СОУХЪ — бел. **сухі**, балг. **сух**; ст.-сл. ОУСТА — бел. **вусны**, балг. **уста** і інш. І /*а/: ст.-сл. БРАТРЪ — бел. **брат**, балг. **брат**; ст.-сл. МАТИ — бел. **маці**, балг. **майка** і інш. У балгарскай мове, аднак, сустракаюцца адзінкавыя выпадкі ўжывання /е/ на месцы праславянскай /*а/: балг. **всеки** (<ВЬСЬ+АКЪ), у бел. **усялякі**, балг. **печеля** (але **печалба**) — руск. **печалиться**, якія можна тлумачыць міжскладовай асіміляцыяй галосных па раду. У беларускай мове на месцы этымалагічнага /*а/ часам сустракаецца /о/: **утойваць**, **засвойваць**, **выкошваць** і інш. Магчыма, гэта звязана са старажытным праславянскім чаргаваннем а//о.

Калі разглядаць лёс познепраславянскай фанемы /*о/ ў аналізуемых мовах, дык трэба адзначыць, што і гэты элемент, як і іншыя функцыянальна моцныя праславянскія галосныя, не падвяргаецца тут істотным зменам. Тым не менш нельга сказаць, што рэфлексацыя дадзенай фанемы вычэрпваецца ў абедзьвюх мовах толькі адным пераўтварэннем. Безумоўна, найбольш распаўсюджаным рэфлексам праславянскай /*о/ ў беларускай і балгарскай з'яўляецца /о/: бел. **нож** — балг. **нож**, бел. **водны** балг. **воден**, бел. **госць** — балг. **гост** і інш. Разам з тым спецыфічна балгарскай з'яўляецца рэфлексацыя /*о/>/ъ/, якая адзначаецца ў словах тыпу **гръм**, **звън** (праўн. ст.-сл. ГРОМЪ, ЗВОНЪ). З'яўленне новабалгарскай /ъ/ на месцы праславянскай /*о/), напэўна, можна тлумачыць тут уплывам такіх балгарскіх форм, як **мъх**, **сън**, **път** (дзе /ъ/ ўзыходзіць да праславянскіх /*ъ/ і /*о/), і кваліфікаваць такі пераход як змяненне па аналогіі; /ъ/ на месцы /*о/ знаходзім і ў сучаснай літаратурнай форме **гълъб** (<*golobь). Можна дапусціць, следам за К. Мірчавым, што /ъ/ узнікае тут як вынік асімілятыўнага ўплыву [ъ] наступнага складу. Характэрным для балгарскай мовы з'яўляецца і пераход /*о/>/е/, які звязаны з працэсам так званай палаталізацыі галосных[2], г. зн. змяненнем рада галоснага пад уздзеяннем папярэдніх мяккіх зычных. З'ява гэтая, якая знайшла адлюстраванне і ў помніках (параўн. вядомыя стараславянскія формы ЖЕНОНѢ, але ДОУШЕНѢ, СЫНОВЪ, але ВРАЧЕВЪ), мела месца яшчэ ў агульнаславянскі перыяд, аднак ужо ў сярэднебалгарскую эпоху помнікі адлюстроўваюць частыя хістанні ў напісанні О і Е ў формах такога тыпу (што, безумоўна, сведчыць пра зацвярдзенне спрадвечна мяккіх зычных), а ў далейшым усё большую моц набірае тэндэнцыя «ўзнаўлення» першапачатковага /о/[3]. У сучаснай балгарскай мове маюцца

формы тыпу **ножове, лъжовен** і інш., /о/ з'яўляецца нават і ў запазычаннях (скажам, **джоб** з **джеб** турэцкай мовы). Тым не менш тут застаецца шэраг лексем, дзе не адбываецца «вяртання» да першапачатковага праславянскага /*о/. Гэта выпадкі тыпу **плачевен, душевен** і інш. Цікава, што такая ж сітуацыя назіраецца і ў беларускай мове. Рэшткі старажытнай пераагласоўкі /*о/>/*е/ можна адзначыць у такіх утварэннях, як **каралеўскі** (але **арлоўскі**), **душэўны** (але **духоўны**), ва ўласных імёнах тыпу **Пальчэўскі, Мілашэўскі** і да т. п. У той жа час тут маюцца формы тыпу **харчовы, грашовы,** дзе этымалагічнае /*о/ адноўлена. Відавочна, гэтыя факты сведчаць аб тым, што калі першапачаткова (у агульнаславянскую эпоху) пераўтварэнне /*о/>/*е/ было абумоўлена пазіцыяй (значыць, з'яўлялася фанетычным працэсам), дык у сучаснай як балгарскай, так і беларускай мове яно набывае характар мены фанем, паколькі з'яўленне /е/ ўжо не вызначаецца ўласцівасцямі папярэдняга гука.

Калі параўноўваць лёс праславянскай функцыянальна моцнай фанемы /*е/ у аналізуемых мовах, дык можна канстатаваць наяўнасць двух відаў рэфлексаў у дадзеным выпадку, а іменна /е/ і /о/. Карэнная розніца, аднак, заключаецца ў тым, што для балгарскай мовы пераход /*е/>/о/ ў з'ява вельмі рэдкая (К. Мірчаў прыводзіць, напрыклад, такія лексемы, як **топлота** (<*tep-), **чопля** (<*čep-), **още** (<*eščе) і нек. інш.), для беларускай жа, як і для іншых славянскіх моў усходняй падгрупы, такое змяненне ў адна з характэрных рыс. Прырода пераагласоўкі /*е/>/о/ ў балгарскай мове хутчэй за ўсё фанетычная[4], а што датычыць усходнеславянскага пераходу /*е/>/о/, дык прычыны яго ўзнікнення не атрымалі ў лінгвістычнай літаратуры адзінага тлумачэння[5]: Мы схіляемся да таго пункту гледжання, што фактары, якія спрыялі такой рэфлексацыі, мелі і фанетычны, і фаналагічны, а таксама аналагічны характар.

Фаналагічныя вынікі развіцця праславянскай галоснай /*у/ (калі іх разглядаць з пазіцый Маскоўскай фаналагічнай школы) з'яўляюцца аднолькавымі ў абедзвюх мовах: /у/ перастае тут існаваць у якасці самастойнай фаналагічнай адзінкі. У дадзеным выпадку назіраецца працэс фанемнай канвергенцыі: /у/×/і/→/і/. Калі, аднак, аналізаваць фанетычны бок гэтага працэса, высвятляецца наступная розніца: у беларускай мове [у] захоўваецца як адна з рэалізацый фанемы /і/, у той час як у балгарскай дыферэнцыяцыі [у] і [і] не існуе і на ўзроўні алафонаў.

У свой час Р. А. Аванесавым было паказана, што працэс пераўтварэння /у/ ў пазіцыйную разнавіднасць /і/ трэба звязваць з фаналагізацыяй апазіцыі цвёрдых і мяккіх зычных, якая стала рэальнай пасля страты «слабых» ераў. І з таго часу, як мяккасць становіцца пазіцыйна незалежнай характарыстыкай зычных, страчваецца і функцыянальная роля апазіцыі /і/—/у/[6]. Тое, што ў беларускай мове захоўваецца фанетычнае адрозненне [і] і [у], а ў балгарскай гэтага не назіраецца, можна растлумачыць рознымі тэндэнцыямі ў развіцці мяккаснай карэляцыі ў разглядаемых мовах. У беларускай, як і ў рускай, фаналагічная катэгорыя цвёрдасці/мяккасці атрымала найбольшае развіццё, і таму [і] і [у] неабходны тут як індэксы адрознення цвёрдых і мяккіх зычных фанем (параўн. руск. **пил — пыл**, бел. **біў — быў** і да т. п.). Для балгарскай мовы характэрны працэс зацвярдзення мяккіх зычных перад галоснымі пярэдняга рада, у тым ліку і перад [і]. Гэта значыць, што ў названай пазіцыі ў балгарскай мове адбываецца нейтралізацыя фаналагічнай прыметы «мяккасць». Менавіта гэтыя акалічнасці і здымаюць неабходнасць не толькі фаналагічнага, але і фанетычнага адрознення [і] і [у].

Калі гаварыць пра змяненне слабых у функцыянальных адносінах праславянскіх галосных фанем у беларускай і балгарскай літаратурных мовах, дык яно адбываецца ў агульным напрамку дэфаналагізацыі насавых галосных, ераў і яць, аднак канкрэтныя вынікі гэтых змен даволі істотна адрозніваліся ў аналізуемых мовах.

На думку С. Б. Бернштэйна, дэназалізацыя з'явілася чыста фізіялагічным працэсам, які не адбіўся на сістэмных адносінах паміж фанемамі і не

быў звязаны з самім функцыянаваннем мовы[7]. З гэтым сцвярджэннем можна згадзіцца ў тым сэнсе, што насавыя галосныя, як ужо адзначалася, уяўлялі сабою элементы функцыянальна слабыя ў праславянскім вакалізме, і таму іх страта не аказвала істотнага ўплыву на функцыяніраванне мовы. Нельга, аднак, не згадзіцца і з Б. М. Гаспаравым, які слушна зазначае, што змяненне насавых непасрэдна працягвае тэндэнцыю да спрашчэння вакалізму, неабходнасць якога ўзнікла пасля манафтангізацыі дыфтонгаў[8]. Увогуле працэс страты рынезму быў дастаткова складаным і шматступеньчатым. Па выніках гэтага працэсу даследуемыя мовы значна адрозніваюцца. Беларуская захоўвае ў цэлым старажытнарускую рэфлексацыю: /*o̯/>/и/, /*e̯/>/а/, напрыклад, **рука** (<*roka), **пяць** (<pe̯tь), **муж** (<*mo̯žь), **мяса** (<*me̯so) і г. д. Для балгарскай характэрна пераўтварэнне /*o̯/>/ъ/ і /*e̯/>/е/: **ръка, пет, мъж, месо** і г. д. Нельга, аднак, сказаць, што ў абедзвюх мовах не існуе ў дадзеным выпадку своеасаблівых «адхіленняў ад нормы». У беларускай мове, напрыклад, на месцы /*e̯/ ў некаторых формах выяўляецца /е/: **гледзячы, запрэгчы** (параўн. з рускімі **глядя, запрячь**). Ф. М. Янкоўскі звязваў з'яўленне тут /е/ з уплывам такіх форм, як **забегчы, залегчы**[9]. У балгарскай на месцы праславянскай /*o̯/ часам сустракаецца /u/: **муден, груб** і інш. Гэта словы, якія яшчэ ў старажытнабалгарскі перыяд мелі дублетныя формы як з /o̯/, так і з /u/, адна з якіх (а іменна з /o̯/) у далейшым была страчана. Адзначым, што і ў сучаснай балгарскай мове захоўваюцца асобныя дублеты, скажам, **гнусен—гнъсен.** Існаванне старажытных дублетных форм, якія захаваліся і да цяперашняга часу, па ўсёй верагоднасці, сведчаць аб пэўнай хісткасці становішча галоснай пасля насавой зычнай, а таму з'яўленне /o̯/ магчыма звязваць тут з камбінаторным уплывам насавога зычнага на чысты галосны /u/.

Праславянская фанема /*ě/ дае вельмі шырокі спектр рэфлексаў, і у сувязі з гэтым узнікаюць цяжкасці ў вызначэнні як фанетычных, так і фаналагічных параметраў дадзенага элемента праславянскага вакалізму. Разам з тым, напэўна, агульнапрынятым з'яўляецца пункт погляду аб двух асноўных напрамках развіцця /*ě/ ў славянскіх мовах. Большасці з іх, у тым ліку і беларускай мове, уласцівы працэс канвергенцыі /*ě/×/*e/→/e/. Што датычыць балгарскай, а таксама польскай мовы, то тут адзначаецца з'ява, якая ў балгарскай лінгвістычнай традыцыі атрымала назву «ятов преглас», г. зн. наяўнасць, з аднаго боку, рэфлекса /е/ на месцы /*ě/, а з другога — пераўтварэння /*ě/>/а/. Трэба сказаць, што гэта розніца рэфлексацыі /*ě/ з'яўляецца адной з самых істотных прымет, якая адрозніваe дзве дыялектныя зоны балгарскай мовы — усходнюю і заходнюю.

З'яўленне рэфлекса /*ě/>/а/ можа матывавацца тым, што праславянская /*ě/ была атрымана ў спадчыну старажытнабалгарскімі дыялектамі як шырокая пярэдняя нізкая галосная /ä/. Далейшае развіццё гэтай фанемы, г. зн. пераўтварэнне /ä/ ў /а/, звязана, як мяркуюць, з развіццём мяккаснай карэляцыі ва ўсходнебалгарскіх дыялектах, калі прымета мяккасці зычных становіцца фаналагічна істотнай, а проціпастаўленне пярэдніх/непярэдніх галосных страчвае фаналагічную актуальнасць[10]. Важна адзначыць, што, з'явіўшыся ў выніку фаналагізацыі мяккасці, рэфлекс /ě/>/а/ ў той жа час умацоўваў мяккасную карэляцыю, якая развівалася ў зычных, паколькі ўзнікалі новыя апазіцыі цвёрдых і мяккіх зычных перад непярэднім /а/. Пагэтаму зусім справядлівым здаецца вывад І. Гуланавай аб тым, што развіццё /*ě/ і фарміраванне мяккаснай карэляцыі —з'явы ўзаемаабумоўленыя ў балгарскай мове[11]. Адносна ўзнікнення другога тыпу рэфлексацыі—пераходу /*ě/>/е/ — выказваюцца розныя пункты погляду, відавочна, аднак, тое, што ў балгарскай літаратурнай мове

фаналагічная каштоўнасць праславянскай фанемы /*ě/ была падзелена паміж галоснымі /а/ і /е/. Ёсць падставы меркаваць, што першапачаткова прычыны такога «падзелу» мелі пазіцыйна-фанетычны характар. Так, І. Лекаў звязвае ажыццяўленне пераагласовак /*ě/ з сінгарманізмам галосных і ў гэтай сувязі адзначае асобую ролю наступнага фанетычнага кантэксту слова[12]. Сапраўды, з'яўленне [а] ці [е] як рэалізацый этымалагічнага /*ě/ звязана тут перш за ўсё з характарам галоснай наступнага складу: параўн. **ля́то — ле́тен, ця́л — це́ли, вя́рна — ве́рен** і г. д. [е] з'яўляецца ў выпадку, калі галосны наступнага складу будзе пярэднім). Важна, аднак, падкрэсліць, што калі разглядаць чаргаванне [е] і [а]ў такіх формах з пазіцый сучаснага стану балгарскай літаратурнай мовы, дык яго трэба кваліфікаваць як марфаналагічнае (тут гукі [е] і [а] з'яўляюцца асноўнымі алафонамі адпаведных фанем). Фактарам, які перашкаджае з'яўленню [а] як рэалізацыі праславянскай /*ě/, лічыцца ненаціскная пазіцыя былога /*ě/ ў слове: параўн. **сняг — снегове́, бряг — брега́** і да т. п. У гэтым выпадку сучаснае чаргаванне націскнога [а] і ненаціскнога [е] трэба прызнаць (зыходзячы з тэарэтычных палажэнняў МФШ) менай алафонаў адной фанемы /а/.

Калі спыняцца на асаблівасцях рэфлексацыі праславянскай фанемы /*ě/ у беларускай мове, дык трэба, акрамя асноўнага, ужо адзначанага, перахода /*ě/>/е/ звярнуць увагу на яшчэ два дастаткова рэдкія для беларускай мовы выпадкі. Па-першае, у шэрагу форм на месцы чакаемага /е/ (</*ě/) сустракаецца /о/. Напрыклад, **гнёзды, вёдры, звёзды** і нек. інш. Па-другое, этымалагічная /*ě/ ў адзінкавых лексемах прадстаўлена як /і/, скажам, у форме **цвіў**. Што датычыць форм з /о/ на месцы /е/, дык, несумненна, яны ўзнікаюць па аналогіі з лексемамі **сёлы, вёслы** і г. д., дзе адбыўся вядомы пераход /е/>/о/. Няяснай застаецца прычына ўзнікнення фанемы /і/ ў формах тыпу **цвіў** (цікава, што такія формы ёсць і ў рускай мове: **мизинец, дитя**, але разам з імі **цвёл**, дзе /о/ ўзнікае па аналогіі). Магчыма дапусціць, што дадзеная фанема ўзнікае тут пад уплывам украінскай мовы, дзе рэфлекс /*ě/>/і/ найбольш распаўсюджаны, аднак усё ж незразумела, чаму гэты ўплыў не адбіўся на іншых формах.

Найбольш значныя адрозненні пры параўнанні лёсу праславянскіх галосных у беларускай і балгарскай літаратурных мовах назіраюцца ў развіцці так званых рэдукаваных галосных /*ъ/ і /*ь/. Калі фіксаваць крайнія кропкі пераўтварэнняў дадзеных фанем ад праславянскага стану да сучаснага, дык высвятляецца, што ў беларускай, як і ў іншых усходнеславянскіх мовах, на месцы /*ъ/ ў моцнай пазіцыі маецца /о/, а на месцы /*ь/ — /е/ (параўн. вядомыя прыклады тыпу *dьnь> **дзень**, *sъnъ> **сон** і да т. п.). У слабой пазіцыі, як вядома, дадзеныя фанемы знікаюць: **сын** (<*synъ), **дня** (<*dьn'a) і інш. Такім чынам, з фаналагічнага пункту гледжання тут назіраецца ў першым выпадку захаванне апазіцыі, але адбываецца яе трансфаналагізацыя, /*ъ/ — /*ь/ замяняецца на /о/ — /е/, а страту слабых ераў можна разглядаць як канвергенцыю фанем: /*ъ/×/*ь/→/∅/.

У балгарскай мове назіраецца некалькі іншая замена, калі мець на ўвазе моцныя еры: /*ъ/ — /*ь/ пераходзіць у /ъ/ — /е/. Напрыклад, праславянскія *mъхъ, *sъnъ адлюстраваны ў балгарскай як **мъх, сън,** праславянскія *lьnъ, *dьnь — як **лен, ден**. Спецыфічна балгарскім з'яўляецца і пераход моцнага /*ь/ у /ъ/: **пън** (<*pьnь), **тъща** (*tьstja) і інш. Рэфлексы слабых ераў таксама маюць у балгарскай сваю спецыфіку. З аднаго боку, ў гэтай мове, як і ў іншых славянскіх, назіраецца знікненне рэдукаваных у слабой пазіцыі: **много** (<*mъogo), **пет** (<*pętь), **син** (<*synъ) і інш., з другога — тут выяўляецца тая ж рэфлексацыя, што і ў моцных ераў: /*ъ/>/ъ/, /*ъ/>/ъ/, напрыклад, **дъно** (параўн. бел. **дно**), **тъма** (параўн. руск. **тьма**), **тъка** (бел. **ткаць**), **жънеш** (бел. **жнеш**).

У сувязі са своеасаблівымі зменамі праславянскіх ераў у балгарскай мове паўстае пытанне, ці можна атаясамліваць /ъ/ у балгарскай з праславянскім /*ъ/? На гэты конт не існуе адзінага меркавання. Не разглядаючы падрабязна розных падыходаў да гэтай праблемы, адзначым, што, на нашу думку, поўнае атаясамліванне гэтых фанем неправамерна, паколькі гэта элементы, якія валодаюць рознымі дыстрыбутыўнымі магчымасцямі, рознай фаналагічнай значнасцю. Ужо адзначалася, што еры разам з некаторымі іншымі галоснымі фанемамі з'яўляліся функцыянальна слабымі элементамі праславянскай вакалічнай сістэмы. Што да балгарскай фанемы /ъ/, дык яна валодае ўсімі прыметамі функцыянальна моцнай фанемы: вялікай частотнасцю, шырокімі дыстрыбутыўнымі патэнцыямі (і ў прыватнасці магчымасцю ўжывання ў абсалютным пачатку слова, чаго не мела праславянская /*ъ/). Адзначым, што развіццю і ўмацаванню фаналагічнага статуса балгарскай /ъ/ спрыялі перш за ўсё два пераўтварэнні — /*о/>/ъ/ і /*ъ/>/ъ/, якіх не адзначаецца ў іншых славянскіх мовах. Як жа адбіліся пералічаныя змяненні праславянскіх галосных /*ъ/ і /*ь/ на вакалічных сістэмах даследуемых моў? Закранаючы беларускую літаратурную мову, можна сказаць, што тут дэфаналагізацыя ераў прыводзіць, як і пры страце насавых галосных, да пэўнага спрашчэння сістэмы, а трансфаналагізацыя /*ъ/—/*ь/→/о/—/е/ спрыяе ўмацаванню функцыянальна моцнай апазіцыі /о/ — /е/. З'яўленне ў балгарскай мове «новага» /ъ/ пацягнула за сабою ўзнікненне так званага «сярэдняга тэмбравага класа» ў сістэме балгарскіх вакалаў, куды ўваходзілі два элементы — /ъ/ і /а/. Па меркаванню М. С. Трубяцкога, наяўнасць такой апазіцыі — з'ява выключна рэдкая для вакалічных сістэм[13].

Вывады, якія дазваляе зрабіць параўнальны аналіз развіцця праславянскіх галосных фанем у беларускай і балгарскай літаратурных мовах, зводзяцца да наступнага: па-першае, відавочна, што тыя элементы вакалічнай сістэмы познепраславянскай мовы, якія былі ахарактарызаваны як функцыянальна моцныя і ў беларускай, і ў балгарскай мове, мелі падобны лёс. У цэлым яны не падвяргаліся істотным зменам ні на беларускай, ні на балгарскай глебе. Выключэнне ў гэтым сэнсе састаўляе фанема /*у/, якая ў беларускай страціла фаналагічны статус, захоўваючыся на алафонным узроўні, а ў балгарскай поўнасцю канвергіравала з /і/. Падругое, развіццё функцыянальна слабых элементаў познепраславянскага вакалізму ў аснове сваёй адбывалася ў адзіным напрамку дэфаналагізацыі насавых галосных, ераў і яць. Тым не менш канкрэтныя вынікі гэтага працэсу ў аналізуемых мовах маюць шэраг адрозненняў. Гэтыя адрозненні звязаны перш за ўсё са змяненнямі насавых галосных і ераў. Калі ў балгарскай мове іх пераўтварэнні вядуць да ўзнікнення новай фанемы /ъ/, дык у беларускай можна назіраць толькі ўмацаванне фаналагічнага статуса тых функцыянальна моцных элементаў, якія былі ўспрыняты беларускай моваю з праславянскай.

[1] Гл.: Колесов В. В. Историческая фонетика русского языка. М., 1980. С. 18—19, 34—35.
[2] Гл.: Нахтигал Р. Славянские языки. М., 1963, С. 72—73.
[3] Мирчев К. Историческа граматика на български език. София, 1978. С. 138—139.
[4] Там жа. С. 135—136.
[5] Гл.: Филин Ф. П. Происхождение русского, украинского, белорусского языков. М., 1972. С. 184.
[6] Гл.: Аванесов Р. И. Русская литературная и диалектная фонетика. М., 1974. С. 238.
[7] Бернштейн С. Б. Очерк сравнительной грамматики славянских языков. М., 1961. С. 243.
[8] Гл.: Гаспаров Б., Сигалов П. Сравнительная грамматика славянских языков. Тарту, 1974. С. 231—232.
[9] Янкоўскі Ф. М. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Мінск, 1983. С. 76.
[10] Стойков Ст. // Български език.1963. КН. 3-4. С. 322.
[11] Гугуланова И. // Съпоставително езикознание, 1978. № 2. С. 66—73.
[12] Леков И. Насоки в развоя на фонологичните системи на славянските езици. София, 1960. С. 62.
[13] Трубецкой Н. С. Основы фонологии. М., 1960. С. 131.